Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej 16
ISSN 1898-4215; e-ISSN 2544-3143
Copyright © by Andrei Matsuk
Creative Commons: Uznanie Autorstwa 3.0 Polska (CC BY 3.0 PL)
http://creativecommons.org/licenses/by/3.0/pl/
https://doi.org/10.31338/2544-3143.si.2023-16.2

*Andrei Matsuk*
Instytut Historii im. Tadeusza Manteuffla Polskiej Akademii Nauk
andrei.macuk@gmail.com
https://orcid.org/0000-0001-5684-5721

# ІНСТРУКЦЫІ ВАЎКАВЫСКІМ ПАСЛАМ НА СОЙМЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ПАНАВАННЕ АЎГУСТА ІІІ (1735–1763 ГГ.)*

## Instructions to the Vawkavysk Envoys to the Polish-Lithuanian Commonwealth Sejm under King August III (1735–1763)

### Abstract

The article presents an analysis of the instructions of the local sejmik (an assembly of the regional nobility) prepared for their Vawkavysk representants (envoys) at the Sejm sessions during the reign of King August III (1735–1763). These instructions included from 4 to 40 points. Vawkavysk envoys at the time of August III were well-known parliamentarians of their epoch; there were such personages as Stefan Olędzki, Michał Antoni Sapieha, Kazimierz Massalski, Ludwik Gerwazy Oskierka and Dominik Suchodolski. They were supporters of the Familia Party (a political faction led by the Czartoryskis and allied families), which sought to reform the state to strengthen it. The instruction to the Vawkavysk envoys covered a wide range of the state's domestic and foreign policy issues, as well as the affairs of the

* Artykuł powstał w ramach realizacji grantu Narodowego Centrum Badań i Rozwoju „Akta sejmikowe powiatu wołkowyskiego z lat 1569–1763".

Vawkavysk poviat (county) itself. These instructions contain items concerning the functioning of the Polish-Lithuanian Commonwealth Sejm, the increase of the size of the army, the reform of the judiciary, economic and financial issues, demands for independence of the Grand Duchy of Lithuania, others regarding private points in the interests of individual noblemen, as well as foreign policy activities (primarily in relation with Russia issues).

**Keywords**: poviat (county) sejmik, Vawkavysk, gentry, nobility, sejmik instructions for envoys

Панаванне Аўгуста III (1735–1763 гг.) стала часам, калі грамадству Рэчы Паспалітай стала зразумелым, што дзяржава знаходзілася ў крызісе і неабходна правесці рэформы дзяржаўнага ладу, каб узмацніць краіну. Аднак у панаванне Аўгуста III гэта не атрымалася ажыццявіць з-за няўдалага заканчэння соймаў, якія павінны былі правесці рэформы. Дакладней, прыняццем пастаноў у панаванне Аўгуста III скончыўся толькі адзін – прымірэнчы сойм 1736 г. Усе іншыя соймы скончыліся безвынікова. Аднак, прапановы па рэфармаванні дзяржавы былі агучаны і на няўдала скончыўшыхся соймах пасламі з розных павятовых соймікаў як Кароны, так і Княства. Не заставаліся ўбаку і паслы з ваўкавыскіх соймікаў. Больш таго, такія ваўкавыскія паслы як ваўкавыскі маршалак Стэфан Алендскі, лоўчы ВКЛ Міхал Антоній Сапега, ваўкавыскі гродскі староста Казімір Масальскі, чашнік ВКЛ Гервазі Людвік Аскерка і ваўкавыскі гродскі староста Дамінік Сухадольскі знаходзіліся сярод вядомых парламентарыяў, якія ў шэрагах магнацкай групоўкі «Фаміліі» выступалі за правядзенне рэформаў, якія мелі ўзмацніць дзяржаву[1].

На пасольскіх сойміках шляхта ВКЛ абірала па двух паслоў на сойм Рэчы Паспалітай. Паслы атрымлівалі інструкцыю, у якой адлюстроўвалася пазіцыя шляхты па розных пытаннях развіцця дзяржавы, прапаноўваліся магчымыя шляхі рэфармавання Рэчы Паспалітай. Інструкцыі дазвалялі

[1] W. Szczygielski, Z. Zielińska, *Olędzki Stefan*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXIII, Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk 1978, s. 798–800; Z. Zielińska, *Oskierko Gerwazy Ludwik*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXIV, Warszawa–Wrocław–Kraków–Gdańsk 1979, s. 358–360; eadem, *Massalski Michał Józef*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XX, Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk 1975, s. 142–143; eadem, *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983, s. 354; А. Мацук, *Стэфан Алендскі – лідар шляхты Ваўкавыскага павета ў сярэдзіне XVIII ст.*, „Геральд Litherland", Гродна 2003, № 11–12, с. 47–54.

вызначыць стаўленне ваяводскай ці павятовай шляхты да зробленых каралеўскім дваром прапаноў на сойм. У інструкцыях знайшлі сваё адлюстраванне як пазіцыі пэўных магнацкіх груповак, так і партыкулярныя (рэгіянальныя) патрабаванні мясцовай шляхты. Менавіта па тэксце інструкцыі можна прасачыць, якая з груповак перамагла на сойміку. Нашай мэтай з'яўляецца даследаванне інструкцый ваўкавыскім паслам на сойм у панаванне Аўгуста III (1735–1763 гг.).

Ваўкавыскі пасольскі соймік вядомы як адзін з найменш зрываемых соймікаў. Пад час шматгадовых пошукаў нам атрымалася выявіць дзевяць ваўкавыскіх інструкцый на соймы 1738, 1744, 1746, 1748, 1750, 1752, 1760, 1761, 1762 гг. Вядома, што ваўкавыскія пасольскія соймікі 1736, 1740, 1754, 1756 і 1758 гг. былі сарваны[2]. Праўда, адбыўся паўторны ваўкавыскі соймік 1758 г. і на ім пасламі былі абраны ваўкавыскі гродскі староста Ян Масальскі і ваўкавыскі канюшы Павал Булгарын. Атрымліваецца, што з паспяхова адбыўшыхся соймікаў не атрымалася знайсці толькі інструкцыю паўторнага ваўкавыскага пасольскага сойміка 1758 г.

Наколькі вялікімі былі гэтыя інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм у панаванне Аўгуста III. У 1738 г. паслам у Ваўкавыску ў інструкцыю змясцілі 18 пунктаў. Інструкцыя ваўкавыскім паслам на сойм 1744 г. складалася з 24 пунктаў, у 1746 г. – з 39, а ў 1748 г. – з 40. У інструкцыю ваўкавыскім паслам на сойм 1750 г. увайшло толькі 6 пунктаў, а ў 1760 – 28. Праз год, у 1761 г., – 4 пункты, а ў 1762 г. – 25 (з іх 10 датычыліся рэкамендацый да ўрадаў). На жаль, складана зразумець, колькі пунктаў знаходзіцца ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1752 г. Без іх уліку інструкцыі ваўкавыскім паслам складаліся ад 6 (на надзвычайны сойм 1750 г.) да 40 пунктаў (на сойм 1748 г.). Соймы 1750 і 1761 гг. былі надзвычайныя, скліваліся да вырашэння канкрэтных пытанняў і мелі меншую часовую працягласць. Гэта і тлумачыць, чаму на гэтыя соймы была самая малая колькасць пунктаў у інструкцыях ваўкавыскіх паслоў (адпаведна 6 і 4). Без уліку надзвычайных соймаў колькасць пунктаў у інструкцыі ваўкавыскіх паслоў складала ад 18 да 40. Калі адкінуць найбольшую і найменшую колькасць пунктаў, то ў сярэднім інструкцыі налічвалі ад 24 да 28 пунктаў.

---

[2] А. Мацук, *«Несрываемые» и «успешные» сеймики в Великом княжестве Литовском во время правления Августа III*, [в:] *XVIII amžiaus studijos*, t. 1: *Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė: tarp tradicijų ir naujovių*, sud. R. Šmigelskytė-Stukienė, Vilnius, 2015, s. 37–38.

Правядзем аналіз тэксту саміх пасольскіх інструкцый. Вельмі важным быў сойм 1744 г., дзе мела быць разгледжана павышэнне колькасці войска[3]. Ваўкавыская шляхта ў 1744 г. патрабавала, каб на сойме не прыступалі да разгляду ніякага пытання да таго часу, пакуль не будзе абраны соймавы маршалак[4]. Зразумелы такі падыход шляхты, бо ў такім выпадку атрымалася выратаваць сойм Рэчы Паспалітай ад зрыву з-за неабрання соймавага маршалка ў першы дзень. Тую самую прапанову зрабіла ваўкавыская шляхта і ў 1746 г., каб на сойме не прыступалі да разгляду ніводнага пытання да выбару соймавага маршалка[5]. Зноў яна паўтаралася ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г.[6]

Шмат месца ў інструкцыях адводзілася праблеме функцыянавання самога сойма. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г., як і раней, патрабавала, каб на сойме не прыступалі да разгляду ніводнага пытання да абрання соймавага маршалка[7]. У гэтай жа інструкцыі ваўкавыская шляхта выказвала вялікія шкадаванні з-за пастаяннага зрыву соймаў. З-за гэтага пашыраліся «беззаконне і злоўжыванні». Асабліва сітуацыя пагоршылася пасля зрыву Кароннага Трыбунала 1749 г. Мясцовая шляхта бачыла «лекамі» для гэтага больш частую прысутнасць караля ў Рэчы Паспалітай[8]. Адначасова ваўкавыская шляхта ў 1752 г. лічыла «ліберум вета фундаментам вольнасці нашай» і патрабавала яго «захавання на соймах, сейміках, пасольскіх і дэпутацкіх ругах»[9]. Як бачна, прычыны зрываў сойма ваўкавыская шляхта бачыла не ў «ліберум вета». Гэтымі прычынамі былі прыватныя справы. Ваўкавыская шляхта ў 1762 г. хацела пацвярджэння на сойме, каб экстраардынарныя соймы скліканіся толькі на падставе рашэння Рады Сената[10]. Тым больш, што заставаліся апасенні ў ператварэнні сойма ў канфедэрацыю.

Шмат месца ў ваўкавыскіх інструкцыях надавалася актуальнаму для ўсей Рэчы Паспалітай пытанню павелічэння войска і яго фінансавага

---

[3] Z. Zielińska, *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983, s. 88–94.

[4] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ), ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 504v.

[5] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 1889v.

[6] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 895v.

[7] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, ark. 1388–1388v.

[8] Ibidem, арк. 1389.

[9] Ibidem, арк. 1389–1389v.

[10] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 295v.

забеспячэння. Ваўкавыская шляхта ў 1744 г. падтрымлівала павелічэнне войска ВКЛ, але без абкладання падаткамі земскіх уладанняў. Прапаноўвалася, каб сродкі на павелічэнне войска былі ўзяты ад трымальнікаў каралеўшчын. Аднак спосабы знайсці іншыя сродкі на павелічэнне войска трэба было абмеркаваць з іншымі соймавымі пасламі, але каб абавязкова не былі абкладзены падаткамі земскія ўладанні. Таксама трэба было дамовіцца аб забеспячэнні артылерыі ВКЛ[11]. Ваўкавыская шляхта ў 1744 г. патрабавала, каб у павялічаным войску было па 100 коней у харугве, а ў рэгіментах – 1000 жаўнераў. Адначасова патрабавалася, каб афіцэрскія чыны атрымлівала шляхта, а іншаземцы не займалі чын вышэй за паручніка[12].

Падтрымала ваўкавыская шляхта ідэю павелічэння войска і перад наступным соймам 1746 г., хоць на ім галоўным было ўжо пытанне рэформы судаводства[13]. Ваўкавыская шляхта ў 1746 г. зноў выказвалася за павелічэнне войска, але без абкладання земскіх уладанняў. Дадатковыя сродкі меркавалася ўзяць з трымальнікаў староstваў. Розніца з папярэднім соймам была ў патрабаванні мясцовай шляхты, каб трымальнікі староstваў прыносілі самастойна прысягу інвентаром, прадстаўленым на Гарадзенскай камісіі[14], а не праз сваіх прадстаўнікоў[15]. Напэўна, такім чынам меркавалася павялічыць адказнасць трымальнікаў за магчымае фальшаванне інвентароў, бо немагчыма ў гэтым было ўжо абвінаваціць свайго прадстаўніка. Як і на сойм 1744 г., ваўкавыская шляхта ў 1746 г. патрабавала, каб пры попісе войска ў харугве было 100 коней, а ў рэгіменце – 1000 жаўнераў. Адначасова мясцовая шляхта хацела, каб афіцэрскія чыны даставаліся шляхце, а іншаземцы не атрымлівалі афіцэрскага чыну вышэй за паручніка[16]. Такія самыя пункты былі ўключаны ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г.[17] Дадаткова ў 1746 г. ваўкавыская

[11] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 504v–505.

[12] Ibidem, арк. 505.

[13] M. Drozdowski, *Działalność budżetowa sejmu Rzeczpospolitej w czasach saskich*, „Roczniki Dziejów Społecznych i Gospodarczych" 1977, t. 38, s. 141–142; Z. Zielińska, *Walka „Familii" o reformę...*, op. cit., s. 189–192.

[14] Маецца на ўвазе Гарадзенская камісія 1737–1738 гг., якая займалася складаннем новага тарыфу дзяржаўных уладанняў. Гл.: H. Palkij, *Praca komisji aukcji wojska w latach 1736–1738*, „Kwartalnik Historyczny" 1999, R. CVI, Nr 1, s. 30–40.

[15] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 1889v–1890.

[16] Ibidem, арк. 1890.

[17] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 895v–896.

шляхта патрабавала, каб на павелічэнне войска былі накіраваны атрыманыя даходы з розных староستваў, каралеўшчын і эканомій, якія да каралеўскага надання знаходзіліся пад уладай падскарбія ВКЛ. Асабліва значнымі мелі быць даходы з Полацкай эканоміі, якая шмат гадоў была незанятай[18]. Таксама ваўкавыская шляхта ў 1746 г. скардзілася, што трымальнікі староستваў нібыта пад выглядам гіберны выбіраюць завышаную колькасць падаткаў. Менавіта таму мясцовая шляхта патрабавала незаконна атрыманыя даходы аддаць на павелічэнне войска[19]. Гэтыя два апошнія пункты адсутнічаюць у інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г. У той жа час у інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г. прапаноўвалася, каб харугвы і рэгіменты войска ВКЛ мелі попіс штогод у маі не перад дэпутатамі вызначанымі Скарбовым Трыбуналам ВКЛ, а перад чатырма мясцовымі ўраднікамі і чатырма камісарамі абранымі паветам, дзе размяшчаліся вайсковыя адзінкі[20].

Праз чатыры гады, у інструкцыі паслам на сойм 1752 г., ваўкавыская шляхта выступала за павелічэнне войска, але пры ўмове, што сродкі на яго не будуць узяты з земскіх уладанняў, якія і так моцна былі абцяжараны падымным. Сродкі на павелічэнне войска прапаноўвалася ўзяць са староستваў. Трымальнікі іх нібыта на падставе выплаты гіберны атрымлівалі з падданых у тры разы большыя даходы, і таму прапаноўвалася пусціць гэтыя звышдаходы на павелічэнне войска. Адначасова мясцовая шляхта хацела, каб самі трымальнікі, а не як раней – праз прадстаўнікоў, прынеслі прысягу на даходы староستваў, устаноўленых Гарадзенскай камісіяй 1736–1738 гг.[21] Яшчэ для павелічэння войска ваўкавыская шляхта ў 1752 г. меркавала выкарыстаць даходы з тытунёвай манаполіі[22]. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. хацела, каб павялічанае войска ВКЛ было апісана і згодна з гэтым попісам кожная харугва складалася са 100 коней, а рэгімент – з 1000 чалавек. Адначасова мясцовая шляхта хацела, каб іншаземцы не атрымлівалі афіцэрскіх чыноў вышэй за чын паручніка[23]. Такім чынам, паўтараліся палажэнні інструкцый ваўкавыскім паслам на соймы 1744 і 1746 гг. Праз восем год, у 1760 г., ваўкавыская шляхта бачыла неабход-

[18] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 1893v–1894.

[19] Ibidem, арк. 1894.

[20] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 897–897v.

[21] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1388v.

[22] Ibidem.

[23] Ibidem.

насць павелічэння войска ў абароне ад «экзатычнага жаўнера» і «гультайства». Неабходныя сродкі прапаноўвалася ўзяць з кварты, бранай са староства. Як было бачна, калі выраслі даходы з каралеўскіх гарадоў, то прапаноўвалася правесці і новую люстрацыю староства для вызначэння «справядлівай кварты»[24]. Яшчэ праз два гады ў інструкцыі паслам на сойм 1762 г. шляхта звяртала ўвагу на «шкоды, якія вынікаюць для Рэчы Паспалітай з так слабых у ёй вайсковых сіл». Менавіта таму прапаноўвалася павялічыць колькасць войска і абмеркаваць шляхі да гэтага на сойме[25]. Такім чынам, у інструкцыі ваўкавыскім паслам распрацаваныя прапановы па павелічэнні войска ад 1744 г. ператварыліся ў 1762 г. толькі ў агульныя выразы аб існаванні праблемы аб слабасці войска Рэчы Паспалітай.

Яшчэ адной важнай праблемай, якая разглядалася на соймах у панаванне Аўгуста III – была праблема судаводства. Ваўкавыская шляхта яшчэ ў інструкцыі паслам на сойм 1744 г. не засталася ўбаку ад праблемы судаводства і выступала за прыняцце «карэктуры права». На яе думку, для паляпшэння судовага працэсу ў Трыбунале ВКЛ, калі разгляд зацягваўся з розных прычын, асабліва патрэбна было скараціць колькасць дыляцый[26]. Ваўкавыская шляхта судзілася з падскарбянкай ВКЛ Канстанцыяй Салагуб у справе завышэння падаткаў з яе ўладанняў і прайграла гэтую справу ў Скарбовым Трыбунале[27]. Мясцовая шляхта лічыла гэта рашэнне несправядлівым. У выніку ваўкавыская шляхта ў 1744 г. скардзілася на дзейнасць Скарбовага Трыбунала ВКЛ, які ўмешваўся ў выплату падаткаў і складанне павятовых тарыфаў. У выніку мясцовая шляхта патрабавала забараніць такое ўмяшанне Скарбовага Трыбунала ВКЛ[28].

Пытанне судаводства было галоўным для разгляду на сойме 1746 г. Ваўкавыская шляхта ў гэтым годзе ў інструкцыі сваім паслам выступала за прыняцце «карэктуры права ў ВКЛ». Асабліва звярталася ўвага на забарону Трыбуналу ВКЛ парушаць канчатковыя судовыя дэкрэты шляхам выдання «заручных лістоў», што перашкаджала правядзенню экзекуцый. Акрамя таго, мясцовая шляхта патрабавала забараніць Трыбуналу ВКЛ выдаваць рашэнні без разгляду судовай справы. Адначасова патрабавала-

[24] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1060v.

[25] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 294v–295.

[26] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 505v–506.

[27] А. Мацук, *Мінская кадэнцыя Трыбунала ВКЛ 1741 г.*, [у:] *Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі*, Мінск 2008, с. 118–123.

[28] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 506.

ся паменшыць колькасць дыляцый, з-за якіх зацягваўся разгляд судовых спраў[29]. Ваўкавыская шляхта ў 1746 г. выступала супраць незаконнага ўмяшання Скарбовага Трыбунала ВКЛ ва ўдакладненне павятовага тарыфу, бо гэтае пытанне знаходзілася толькі ў кампетэнцыі павета[30]. Як бачым, гэты пункт зноў датычыўся канфлікту ваўкавыскай шляхты з Канстанцыяй Салагуб.

У інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г. мясцовая шляхта звяртала ўвагу на непарушнасць канчатковага судовага дэкрэту Трыбунала ВКЛ. Насуперак гэтага яго выкананне адкладалася Трыбуналам ВКЛ з дапамогай «заручных лістоў». Таксама ваўкавыская шляхта патрабавала, каб Скарбовы Трыбунал ВКЛ не ўмешваўся ў складзеныя паветамі тарыфы. Гэта супярэчыла пастановам сойма 1717 г., які складанне тарыфу ўскладаў на паветы Княства (зразумела, што ў першую чаргу мелася на ўвазе судовая справа Канстанцыі Салагуб з Ваўкавыскім паветам)[31].

Праз два гады, у 1750 г., ваўкавыская шляхта вельмі шкадавала аб зрыве Кароннага Трыбунала 1749 г. Каб такое не паўтарылася ў ВКЛ, мясцовая шляхта прапаноўвала наступныя дзеянні. Пасля абрання дэпутатаў на грамнічных сойміках яны на працягу трох тыдняў мелі прадставіць свае крэдэнсы ў Трыбунал ВКЛ. У такі ж тэрмін мелі быць прадстаўлены ў Трыбунал ВКЛ і пратэстацыі супраць іх выбару. Трыбунал ВКЛ меў судзіць тых шляхцічаў, якія не даказалі законнасць сваіх пратэстаў. Абраныя дэпутаты мелі прынесці прысягу ў пачатку працы Трыбунала ВКЛ[32]. Таксама ваўкавыская шляхта ў 1750 г. звяртала ўвагу, што «карэктура права ВКЛ» складзеная на мінулых соймах і цяпер захоўвалася ў некалькіх экзэмплярах. Мясцовая шляхта хацела, каб яна была ўзгоднена з тымі праектамі, якія меліся, і былі прыняты на сойме[33].

У інструкцыі паслам на сойм 1752 г. ваўкавыская шляхта падтрымлівала прыняцце новай карэктуры правоў ВКЛ, а таксама апісанне функцыянавання Трыбунала ВКЛ[34]. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. скардзілася, што Скарбовы Трыбунал ВКЛ умешваецца ў зверку тарыфу Ваўкавыскага павета і ў справу выплаты вызначаных падаткаў насуперак гэтаму тарыфу.

---

[29] Ibidem, арк. 1890v–1891.

[30] Ibidem, арк. 1891.

[31] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 896–896v.

[32] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 211v–212.

[33] Ibidem, арк. 212.

[34] Ibidem, арк. 1389.

Мясцовая шляхта патрабавала забароны так рабіць Скарбоваму Трыбуналу ВКЛ на падставе соймавай канстытуцыі 1717 г.[35] Гэты пункт быў водгукам справы ваўкавыскай шляхты з Канстанцыяй Салагуб. У 1760 г. у інструкцыі ваўкавыскім паслам ужо знаходзіўся толькі кароткі пункт у падтрымку карэктуры для скарачэння часу разгляду справы ў Трыбунале ВКЛ[36].

Шмат месца ў інструкцыі ваўкавыскім паслам займалі эканамічныя пытанні. Ваўкавыская шляхта ў 1748 г. скардзілася на шкоды гандлярам на «партовых рэках» з-за розных завалаў. Прапаноўвалася абмеркаваць спосабы ачышчэння гэтых рэк, якое меў зрабіць падскарбі ВКЛ. Не казалася адкуль трэба ўзяць на гэта сродкі, але абавязкова патрабавалася выключыць абкладанне выдаткамі праплываўшых караблёў[37]. Паўтаралася гэтае патрабаванне ў інструкцыі ваўкавыскім паслам у 1752 г.[38] У тым жа 1752 г. ваўкавыская шляхта захацела паўторнага зацвярджэння соймавых канстытуцый аб бяспецы гандлю[39]. У той жа інструкцыі ваўкавыская шляхта звяртала ўвагу, што шмат гадоў Рэч Паспалітая захоўвае мір з суседзямі, але яе эканоміка не мае з гэтага ніякіх карысцяў. Менавіта таму прапаноўвалася развіваць гарады і мястэчкі, заснаваўшы ў іх мануфактуры, павялічыўшы колькасць рамеснікаў і забяспечыўшы гандаль[40].

Згодна з пазіцыяй ваўкавыскай шляхты ў 1744 г. аб функцыянаванні рэгулярнай пошты ваўкавыскія паслы мелі дамовіцца з пасламі іншых паветаў. Прычым было забаронена, каб Скарбовы Трыбунал ВКЛ адмяняў падатак на падводы з гарадоў і мястэчак, які збіраўся для выплатаў на пошту[41]. Гэтыя самыя патрабаванні ваўкавыская шляхта змясціла ў інструкцыі сваім паслам на сойм 1746 г.[42] У 1748 г. ваўкавыская шляхта зноў хацела, каб Скарбовы Трыбунал ВКЛ «згодна з дэкрэтам» не вызваляў гарады і мястэчкі ад выдачы падводнага падатку. Таксама паўтаралася і пажаданне, каб паслы дамовіліся з пасламі іншых паветаў аб функцыянаванні пошты[43].

---

[35] Ibidem, арк. 1390.

[36] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1060v.

[37] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 898.

[38] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1389.

[39] Ibidem, арк. 1389v.

[40] Ibidem, арк. 1388v.

[41] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 506v.

[42] Ibidem, арк. 1891v.

[43] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 896v–897.

У 1744 г. у інструкцыі сваім паслам ваўкавыская шляхта падтрымлівала каралеўскую прапанову адкрыць манетны двор у Рэчы Паспалітай. Кіраваць манетным дваром мелі падскарбіі Кароны і Княства. Падскарбіі ж мелі кампенсаваць потым зробленыя каралём фінансавыя траты на адкрыццё манетнага двара. Акрамя таго, была зразумела неабходнасць здабычы «мінералаў» для працы манетнага двара. Менавіта таму прапаноўвалася каралю дазволіць і прафінансаваць іх здабычу ў Алькускіх гарах. Усе каралеўскія траты падскарбіі мелі кампенсаваць ужо пасля першай здабычы «мінералаў»[44]. Нічога не змянілася і праз два гады ў 1746 г. Дадавалася толькі тое, што падскарбіі яшчэ мелі вызначыць абменны курс з суседнімі краінамі[45]. У такой жа фармулёўцы справа адкрыцця манетнага двара і дабычы «мінералаў» патрапіла ў інструкцыю ваўкавыскім паслам на наступны сойм 1748 г.[46] Яшчэ праз чатыры гады, у 1752 г., ваўкавыская шляхта падтрымлівала каралеўскую прапанову аб заснаванні манетнага двара. Кіраваць ім мелі падскарбіі Кароны і Княства. Яны ж мелі сфарміраваць яго адміністрацыю і ўстанавіць абменны курс з суседнімі краінамі. Мясцовая шляхта выступала за забарону ўжывання фальшывых грошай[47]. У інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1760 г. у агульных выразах быў змешчаны пункт у падтрымку адкрыцця манетнага двара ў Рэчы Паспалітай для «ўмацавання Айчыны»[48]. Ужо ў 1761 г. у інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм аб гэтым казалася куды падрабязней. У адкрыцці манетнага двара бачыўся адзін з крокаў для паляпшэння гандлю з замежнымі краінамі, бо новыя грошы мелі дапамагчы вывесці з абароту вялікую колькасць фальшывых грошай[49]. У 1762 г. ваўкавыская шляхта зноў патрабавала адкрыцця ў Рэчы Паспалітай манетнага двара[50].

Увогуле Сямігадовая вайна 1756–1763 гг. прынесла значную колькасць падробленых (фальшывых) грошай. У 1760 г. у інструкцыі ваўкавыскіх паслоў патрабавалася вырашыць праблему абменнага курсу, ад нявырашанасці якога ўчыняліся вялікія шкоды для гандлю[51]. Надзвычайны сойм

---

[44] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 505–505v.

[45] Ibidem, арк. 1890–1890v.

[46] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 896.

[47] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1388v–1389.

[48] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1061.

[49] Ibidem, арк. 1442v–1443.

[50] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 295.

[51] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1061.

1761 г. быў прысвечаны пытанню абменнага курсу, які складана было вызначыць з-за вялікай колькасці фальшывых грошай. Ваўкавыская шляхта вырашыла, што новы абменны курс мае быць вызначаны падскарбіямі. Пасля яго вызначэння яны мелі інфармаваць аб ім праз адпаведныя выдрукаваныя ўніверсалы[52]. Ваўкавыская шляхта ў 1762 г. у агульных выразах выказвала пажаданні, каб пытанні фальшывых грошай былі вырашаны падскарбіямі[53].

Знайшлося ў інструкцыях ваўкавыскім паслам месца і пытанню падатkaў. У інструкцыі паслам на сойм 1738 г. ваўкавыская шляхта катэгарычна патрабавала адмены падымнага падатку. Прычым хацела, каб на сойме не абмяркоўваліся ніякія іншыя пытанні да таго часу, пакуль не будзе адменены падымны падатак[54]. Адначасова ў 1738 г. патрабавала ваўкавыская шляхта, каб сойм зацвердзіў адкладзеную на сойме 1726 г. пастанову аб памяншэнні колькасці дымоў у Ваўкавыскім павеце і Віцебскім ваяводстве[55]. Ваўкавыская шляхта ў 1744 г. прасіла ў выпадку, калі не ўдасца адмяніць падымны падатак, то хаця б паменшыць колькасць дымоў для Ваўкавыскага павета і Віцебскага ваяводства, што ўжо прапаноўвалася на сойме 1726 г., але было адкладзена да наступных соймаў[56]. Безумоўна, такое памяншэнне колькасці дымоў мела паменшыць і падымнае. Паўтарала сваё патрабаванне ваўкавыская шляхта паслам перад наступнымі соймамі 1746 г.[57] і 1748 г.[58] Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. зноў прасіла, калі не адмены, то хаця б памяншэння колькасці дымоў у іх павеце, як і ў Віцебскім ваяводстве[59]. Ваўкавыская шляхта не магла адмяніць падымнае і хацела хоць паменшыць яго памер. Менавіта таму, напэўна, ваўкавыская шляхта ў 1746 г. хацела прасіць згоды сойма на складанне новага тарыфу падымнага Ваўкавыскага павета[60]. Паўтарала яна сваю просьбу ў 1752 г. у крыху змененым выглядзе, калі прасіла, каб сойм дазволіў правесці зверку тарыфу падымнага для Ваўкавыскага павета. Да гэтага – каб

[52] Ibidem, арк. 1442.
[53] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 295v–296.
[54] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 423–423v.
[55] Ibidem, арк. 423v.
[56] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 506–506v.
[57] Ibidem, арк. 1891–1891v.
[58] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 896v.
[59] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1389v.
[60] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 1894.

было дазволена ў такім выпадку ваўкавыскай шляхце абраць камісараў для зверкі такога тарыфу[61]. Яшчэ ў 1760 г. ваўкавыская шляхта заяўляла, што ў павеце няма столькі дымоў як вызначана і прасіла правесці зверку для справядлівай выплаты падаткаў[62].

У інструкцыі паслам на сойм 1738 г. ваўкавыская шляхта выказала сваю незадаволенасць, што земскія ўладанні праз розныя фундушы трапляюць ва ўласнасць да духавенства. Мясцовая шляхта патрабавала спыніць такія пераходы ўладанняў ад шляхты да духавенства[63]. Перад соймам 1748 г. вельмі моцнымі былі прэтэнзіі шляхты да духавенства, якое атрымлівала ва ўласнасць шляхецкія ўладанні. Не засталася ўбаку ад гэтай праблемы і ваўкавыская шляхта. У інструкцыі сваім паслам яны выступалі супраць перадачы шляхецкіх уладанняў ва ўласнасць духавенству праз фундушы без прысягі, заставы, выдэркафы[64] ці якіясьці іншыя. Прасілі зрабіць выключэнні толькі для славутых кляштараў у Барунах і Жыровічах (каб для свайго забеспячэння барунскі выкупіў уладанняў на 20 тысяч злотых, а жыровіцкі – 50 тысяч злотых)[65].

Закраналіся пытанні і іншых падаткаў. Ваўкавыская шляхта ў інструкцыі паслам на сойм 1744 г. скардзілася на занадта вялікія падаткі чопавага і шэлежнага ў Ваўкавыскім павеце, вызначаныя ў 1717 г., і хацела іх памяншэння[66]. Паўтаралася гэтая скарга ваўкавыскім паслам і на наступны сойм 1746 г.[67], а потым і ў 1752 г.[68] Ваўкавыская шляхта ў 1744 г. скардзілася на шкоды Скарбу ВКЛ ад прыватных мытняў на «партовых рэках», і таму патрабавала іх скасавання. Таксама патрабавалася адмяніць пашпарты і пратэкцыі тым, хто займаўся гандлем[69]. Ваўкавыская шляхта

---

[61] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1389v.

[62] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1061v.

[63] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 425–425v.

[64] Назва набыцця працэнта ад даходу (рэнты). Уласніку ўладання давалася вызначаная грашовая квота, за якую той абавязаны быў выдаваць са штогадовага даходу (рэнты) пэўную суму (звычайна 5–8% ад даходу). Гэтая сума грошай плацілася ці пажыццёва, ці вызначаную колькасць гадоў. Уласнік уладання мог вызваліцца ад выплаты штогадовых працэнтаў, калі выплачваў усю суму атрыманых грошай.

[65] Z. Zielińska, *Walka „Familii” o reformę...*, op. cit., s. 247–249; НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 897.

[66] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 506.

[67] Ibidem, арк. 1891.

[68] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1390.

[69] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 505v.

ў 1746 г. у інтарэсах Скарбу ВКЛ хацела адмены прыватнага мыта на рэках, а таксама ліквідаваць пашпарты і пратэкцыю тым, хто гандляваў[70]. У 1748 г. ваўкавыская шляхта ў інструкцыі паслам патрабавала ад Скарбу ВКЛ адмены прыватнага мыта на рэках, маставога падатку і іншых перашкод для гандляваўшай шляхты на суднаходных рэках[71]. У двух месцах у гэтай інструкцыі паслам на сойм 1748 г. успаміналася пра забарону іншаземцам працаваць на мытні і адміністратарамі ў эканоміях[72]. За дзесяць гадоў да гэтага ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1738 г. мясцовая шляхта занесла пункт, каб ад трымання «ўсялякіх добраў, пошты, мытні і камор габрэі выключаны былі». Асабліва падкрэслівалася, што гэта забаронена і зараз законам, але габрэі трымаюць уладанні, пошты, мытні і каморы, бо маюць моцную падтрымку[73]. У інструкцыі не казалася ад каго канкрэтна зыходзіць гэта падтрымка. Аднак, усім было зразумела, што прычынай была барацьба пасэсараў «нойбургскіх уладанняў» супраць нясвіжскіх Радзівілаў, якія як раз прызначалі эканомамі ў гэтых уладаннях габрэяў[74].

Адзываючыся да каралеўскай інструкцыі аб аднаўленні гарадоў, ваўкавыская шляхта ў інструкцыі сваім паслам на соймы 1744 і 1746 гг. прасіла падтрымаць памяншэнне чопавага і шэлежнага для горада Ружаны, які меў значныя шкоды ад гэтых вялікіх падаткаў[75].

Асаблівае месца адводзілася стану сталіцы ВКЛ – Вільні. Ваўкавыская шляхта ў 1750 г. звяртала ўвагу на гаротны стан «метраполіі» Вільні з-за шматлікіх пажараў. Да таго ж вялікія шкоды гораду прыносілі пастоі дэпутатаў Трыбунала ВКЛ. Менавіта таму мясцовая шляхта прасіла вызваліць Вільню ад дэпутацкіх пастояў і прапаноўвала паветам ВКЛ абдумаць шляхі для размяшчэння дэпутатаў, але каб гэта рабілася без шкоды шляхце[76]. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. прасіла звярнуць увагу на гаротны стан «метраполіі ВКЛ» Вільні ад пажараў[77].

---

[70] Ibidem, арк. 1890v.

[71] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 896.

[72] Ibidem, арк. 896, 897v.

[73] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 426, 430.

[74] Падрабязней аб гэтым: А. Мацук, *Стэфан Алендскі – лідар шляхты Ваўкавыскага павета ў сярэдзіне XVIII ст.*, „Геральд Litherland”, Гродна 2003, № 11–12, с. 47–54; idem, *Рух пасэсараў «нойбургскіх уладанняў»*, „Геральд Litherland”, Гродна 2007, №17, с. 26–37.

[75] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 508v, 1892v.

[76] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 212.

[77] Ibidem, арк. 1390.

Шмат месца ў інструкцыях ваўкавыскім паслам займала месца абароны самастойнасці ВКЛ. Ваўкавыская шляхта ў інструкцыі паслам на сойм 1760 г. катэгарычна патрабавала, каб урады ў ВКЛ не былі надаваны караняжам[78]. Успамінала гэтае патрабаванне ваўкавыская шляхта ў 1744 г.[79] і 1746 г.[80], а потым і паслам на сойм 1750 г.[81] Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. скардзілася на значную колькасць каралеўскіх наданняў сенатарскіх і дыгнітарскіх урадаў ВКЛ караняжам. Пры гэтым цалкам забываліся заслугі шляхты ВКЛ[82]. Яшчэ раней, у 1738 г., ваўкавыская шляхта ў інструкцыі сваім паслам на сойм успамінала: «Хоць тое шматлікімі канстытуцыямі зацверджана, што каронныя вакансіі літвінам, а літоўскія – каронным даваны быць не маюць»[83]. Такое самае патрабаванне паўтаралася ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г.[84] Адначасова ў той жа інструкцыі ваўкавыская шляхта прасіла вярнуць прэрагатывы для міністэрскага ўрада надворнага падскарбія ВКЛ па кіраванні над эканоміямі[85]. Зразумела, што гэты пункт быў змешчаны ў інтарэсе магнацкага роду Сапегаў, бо надворным падскарбіем ВКЛ быў Юзаф Францішак Сапега. У 1760 г. ваўкавыская шляхта выказвала крыўду, што вакансіі ВКЛ атрымлівалі караняжы і прасіла ў будучым надаваць іх толькі літвінам[86].

Ваўкавыская шляхта ў 1750 г. патрабавала ў караля не склікаць экстраардынарны сойм у тэрмін ардынарнага (звычайнага) сойма, бо ў такім выпадку парушалася альтэрнатыва правядзення соймаў[87]. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. скардзілася, што альтэрнатыва правядзення соймаў была парушана правядзеннем мінулага сойма 1750 г. у Варшаве. Менавіта таму мясцовая шляхта прасіла прыняць чарговую пастанову сойма ў абарону альтэрнатывы правядзення соймаў[88]. Пільнаваць альтэрнатыву правядзення соймаў Рэчы Паспалітай прасіла ў 1760 г. і ваўкавыская шляхта[89].

[78] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1057, 1061v.

[79] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 508v–509.

[80] Ibidem, арк. 1893.

[81] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 212.

[82] Ibidem, арк. 1389v.

[83] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 424v, 429v.

[84] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 898v.

[85] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 424v.

[86] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1061v.

[87] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 211v.

[88] Ibidem, арк. 1389.

[89] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1057, 1061v.

У сваю чаргу ў 1752 г. ваўкавыская шляхта патрабавала, каб кароль часцей знаходзіўся ў Рэчы Паспалітай[90]. Ваўкавыская шляхта ў 1762 г. хацела, каб былі адноўлены попісы на дзень Святога Міхала[91].

Адначасова, як і ва ўсім ВКЛ, ваўкавыская шляхта абараняла Рэч Паспалітую ад кіравання іншаземныхураднікаў. У 1760 г. ваўкавыская шляхта звяртала ўвагу Аўгуста III, згодна з законамі Рэчы Паспалітай, «каб іншаземныя міністры не прэтэндавалі на кіраванне і да нарадаў дапушчаны не былі, таксама клопат аб польскіх інтарэсах на сябе не бралі»[92]. У 1761 г. ваўкавыская шляхта выступала супраць дзейнасці іншаземных міністраў у Рэчы Паспалітай і патрабавала, каб згодна з пактамі канвентаў кароль «тых аддаліць хацеў», а замест іх справамі Рэчы Паспалітай займаліся міністры Кароны і Княства[93].

Утрымліваліся ў інструкцыях ваўкавыскім паслам і прыватныя пункты ў інтарэсах асобных магнатаў і шляхцічаў. У інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1738 г. доўга пералічваліся заслугі і выдаткі памерлага Казіміра Лявона Сапегі пад час займання ўраду генерала артылерыі ВКЛ. У выніку мясцовая шляхта прасіла якой-небудзь кампенсацыі ад караля для яго родзічаў (у першую чаргу меліся на ўвазе сыны Аляксандр і Міхал Ксаверы)[94]. Таксама ў 1738 г. мясцовая шляхта цікавілася аб магчымасці кампенсацыі мясцоваму шляхцічу Тэафілу Дамаслаўскаму за страчаны вайсковы чын[95]. Праз шэсць год, у 1744 г., ваўкавыская шляхта скардзілася на значныя шкоды ваўкавыскаму войскаму і ваўкавыскаму падстаросту Тэафілу Дамаслаўскаму за забранне падчас бескаралеўя ў яго чыну палкоўніка ў пешым рэгіменце вялікай булавы ВКЛ. Шляхта разумела, што немагчыма ўжо вярнуць гэты афіцэрскі чын, але ў такім выпадку прасіла якой-небудзь кампенсацыі Дамаслаўскаму[96]. Праз два гады, у 1746 г., яна зноў рэкамендавала за заслугі ваўкавыскага войскага і ваўкавыскага падстаросту Тэафіла Дамаслаўскага, але рабіла гэта ў больш агульных выразах[97]. Больш за тое, ваўкавыская шляхта ў 1746 г. прасіла кампенсаваць

[90] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1389.
[91] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 296.
[92] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1056v–1057, 1061.
[93] Ibidem, арк. 1435.
[94] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 424v.
[95] Ibidem.
[96] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 507v–508.
[97] Ibidem, арк. 1892–1892v.

панесеныя страты за меўшыміся асігнацыямі за 46 гадоў ваеннай службы ваўкавыскаму гараднічаму Міхалу Быкоўскаму Лопату. Калі гэтага зрабіць не атрымаецца, то прапаноўвалася прасіць караля Аўгуста III проста ўзнагародзіць Лопата[98]. Знайшлося месца ў інструкцыі ваўкавыскім паслам у тым жа 1746 г. і для паручніка коннага рэгіменту польнай кароннай булавы Аляксандра Смагаржэўскага, які быў захоплены на некалькі гадоў у прускае войска і таму панёс значныя шкоды ў сваіх уладаннях[99]. Справа кампенсацыі для Смагаржэўскага паўтаралася і ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1748 г.[100] У тым жа 1748 г. да каралеўскіх наданняў рэкамендаваліся вялікі і польны гетманы ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл і Міхал Масальскі, а таксама ўспаміналіся ранейшыя рэкамендацыі для падляшскага ваяводы Міхала Антонія Сапегі, стражніка ВКЛ Антонія Пацея і вышэйзгаданага Тэафіла Дамаслаўскага[101]. У 1752 г. у інструкцыі сваім паслам ваўкавыская шляхта прасіла за зробленыя заслугі надаць урад падканцлера ВКЛ Міхалу Антонію Сапегу, а таксама аддзячыць яму фінансава[102]. У 1760 г. былі змешчаны рэкамендацыі адразу для вялікага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла, канцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага, падканцлера ВКЛ Міхала Антонія і крайчага ВКЛ Міхала Ксаверыя Сапегаў (апошні за выдатнае выкананне функцый маршалка Трыбунала ВКЛ), падскарбія ВКЛ Юрыя Флемінга, Масальскіх (пры гэтым рэкамендаваўся да ўрада рэферэндарыя ВКЛ Ігнат Масальскі, які да таго ж меў і падтрымку віленскага біскупа да гэтага ўрада), Агінскіх і Адама Бжастоўскага (асабліва падкрэслівалася яго заслугі, калі быў маршалкам Трыбунала ВКЛ)[103]. У 1761 г. у інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм была змешчана толькі адна рэкамендацыя для стражніка ВКЛ Людвіка Пацея, якому мясцовая шляхта прасіла надаць вызваліўшыся ўрад падканцлера ВКЛ[104]. Ваўкавыская шляхта ў 1762 г. рэкамендавала да ўрадаў вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводы польнага гетмана ВКЛ і віленскага кашталяна Міхала Масальскага[105].

---

[98] Ibidem, арк. 1892v.

[99] Ibidem, арк. 1893v.

[100] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 898v.

[101] Ibidem, арк. 898.

[102] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 1391.

[103] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1062–1062v.

[104] Ibidem, арк. 1443–1443v.

[105] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 296.

Знаходзіліся ў інструкцыях ваўкавыскіх паслоў і пункты па замежнай палітыцы. Шляхта з ваўкавыскага сойміка ў 1746 г. толькі хацела, каб Рэч Паспалітая вызначыла сваіх паслоў да замежных дзяржаў[106]. У інструкцыі сваім паслам у 1748 г. ваўкавыская шляхта патрабавала, каб не выдаваліся пашпарты замежным караблям на падставе нібыта транспарціроўкі зброі, якія ў рэальнасці выкарыстоўваліся купцамі для гандлю[107]. Безумоўна, што пад такімі караблямі разумеліся расійскія, якія праз Заходнюю Дзвіну мелі дазвол транспарціроўкі зброі да Рыгі. Акрамя таго, у тым жа годзе ў інструкцыі ваўкавыскім паслам знаходзілася патрабаванне, каб Курляндыя была вернута пад уладу Рэчы Паспалітай, бо ранейшыя выбары курляндскім герцагам Эрнста Бірона не былі пацверджаны соймам 1736 г. Больш таго, ваўкавыская шляхта патрабавала, каб у далейшым ніякія замежныя сілы не ўмешваліся ў справы «гэтай правінцыі» (Курляндыі)[108]. Зразумела, што гэты пункт меў яўна антырасійскую накіраванасць, якая фактычна дамінавала ў Курляндыі і вызначала, хто стане будучым яе герцагам. Таксама ваўкавыская шляхта ў 1748 г. патрабавала, каб замежныя войскі ні пад якім прэтэкстам не праходзілі праз Карону і Княства, а толькі з дазволу сойма Рэчы Паспалітай[109]. Ваўкавыская шляхта ў 1750 г. скардзілася, што скарб ВКЛ мае значныя шкоды ад таго, што расійскія віціны маюць каралеўскія пашпарты і таму не плацяць мыта. Мясцовая шляхта патрабавала, каб кароль больш не выдаваў такіх пашпартоў. Больш за тое, трэба было дамовіцца з расійскім паслом аб кампенсацыі скарбу Рэчы Паспалітай за мінулыя гады такога бязмытнага плавання праз Княства расійскіх купцоў[110]. Паўтараўся гэты пункт і праз два гады, але да яго далучаліся і іншыя, якія тычыліся адносін усё з той жа Расіяй. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. наракала на значную шкоду Скарбу ВКЛ з-за праезду без выплаты мыта расійскіх купцоў на падставе каралеўскіх пашпартоў. Расійскія купцы з такімі пашпартамі правозілі тавары, а не, як было абяцана, правіянт для войскаў. Мясцовая шляхта патрабавала не выдаваць такіх пашпартоў і дамовіцца з расійскім паслом аб кампенсацыі панесеных у мінулыя гады страт Скарбу ВКЛ з-за бязмытнага праезду расійскіх

[106] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 14, арк. 1894.

[107] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 15, арк. 897v.

[108] Ibidem.

[109] Ibidem.

[110] НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 16, арк. 212.

купцоў[111]. Ваўкавыская шляхта ў 1752 г. прасіла старацца ў расійскага ўрада аб вяртанні ў Курляндыю яе герцага Эрнста Бірона[112]. Таксама яна звяртала ўвагу на значныя шкоды на мяжы ад Расіі і для іх вырашэння прасіла абраць памежных суддзяў[113]. У тым жа 1752 г. ваўкавыская шляхта для «гонару» Рэчы Паспалітай прасіла аднавіць пасольствы пры замежных дварах[114].

У інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1738 г. мясцовая шляхта выказвала пажаданне на перамовы з замежнымі пасламі, але толькі для пацвярджэння раней заключаных трактатаў і каб ні ў якім разе яны не датычыліся ўдзелу Рэчы Паспалітай у вайне[115]. У той жа інструкцыі паслам ваўкавыская шляхта наракала на прускае войска і шкоды ад яго для ВКЛ, а асабліва на вярбоўку жаўнерамі жыхароў Княства як у ім самім, так і за мяжой[116]. Ужо ў 1760 г. ваўкавыская шляхта звяртала ўвагу, што ў выніку прымірэння ўдзельнікаў вайны (размова ідзе пра Сямігадовую вайну 1756–1763 гг.) неабходна прыняць удзел у абмеркаванні магчымых мірных трактатаў, каб у іх не было чаго «шкоднага» для Рэчы Паспалітай[117]. У іншых тэрмінах гэты пункт знаходзіцца і ў інструкцыі ваўкавыскім паслам на сойм 1761 г.[118] Ваўкавыская шляхта ў 1762 г. заўважала, што пачынаюцца мірныя перамовы паміж дзяржавамі, якія ўдзельнічалі ў вайне. Праўда, прасіла пры гэтым, каб перамовы не прывялі да парушэння межаў Рэчы Паспалітай. А каб не было ёй якой крыўды, прапаноўвалася даслаць паслоў на гэтыя мірныя перамовы[119]. Таксама ваўкавыская шляхта ў 1762 г. прасіла, каб былі адноўлены раней вызначаныя перамовы замежных міністраў з міністрамі ВКЛ[120].

Такім чынам, інструкцыі ваўкавыскім паслам складаліся ад чатырох (на надзвычайны сойм 1761 г.) да сарака пунктаў (на сойм 1748 г.). У сярэднім інструкцыі складаліся ад 24 да 28 пунктаў. У іх разглядалася

---

111 Ibidem, арк. 1389.
112 Ibidem.
113 Ibidem, арк. 1390.
114 Ibidem, арк. 1390v.
115 НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 12, арк. 424.
116 Ibidem.
117 НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 19, арк. 1060v–1061.
118 Ibidem, арк. 1443.
119 НГАБ, ф. 1710, воп. 1, спр. 20, арк. 295–295v.
120 Ibidem, арк. 295v.

шырокае кола пытанняў як па ўнутранай і знешняй палітыцы дзяржавы, так і па справах самога Ваўкавыскага павета. Інструкцыі ваўкавыскім паслам у панаванне Аўгуста III утрымліваюць пункты наконт функцыянавання сойма Рэчы Паспалітай, павелічэння войска, рэфармавання судовай сістэмы, эканамічных і фінансавых пытанняў, самастойнасці ВКЛ, прыватныя пункты ў інтарэсе асобных магнатаў і шляхцічаў, а таксама знешнепалітычнай дзейнасці (у першую чаргу ў справе ўзаемаадносін з Расіяй). Заўважна, ваўкавыская шляхта прадстаўляла сваё бачанне вайсковай, судовай і скарбовай рэформы, якія прапаноўваліся для разгляду соймамі 40-х – пачатку 50-х гг. XVIII ст. Бачна, што ў канцы панавання пункты ў ваўкавыскіх інструкцыях становяцца больш лаканічнымі. Гэта было адлюстраваннем агульнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай у канцы панавання Аўгуста III, калі прыхільнікі каралеўскага двара не вельмі хацелі рэформаў дзяржаўнага ладу, а прадстаўнікі антыкаралеўскай апазіцыі з магнацкай групоўкі «Фамілія» планавалі іх правядзенне ўжо пасля панавання гэтага караля.

## References


**Archival sources**

Nacyânal'ny gìstaryčny arhìŭ Belarusì ŭ Mìnsku, f. 1710, vop. 1, spr. 12; spr. 14; spr. 15; spr. 16; spr. 16; spr. 19; spr. 20.

**Literature**

Drozdowski M., *Działalność budżetowa sejmu Rzeczpospolitej w czasach saskich*, „Roczniki Dziejów Społecznych i Gospodarczych” 1977, t. 38, s. 119–144.

Macuk A., *Mìnskaâ kadèncyâ Trybunala WKL 1741 g.*, [u:] *Mìnsk ì mìnčane: dzesâc’ stagoddzâŭ gìstoryì*, Mìnsk 2008, s. 118–123.

Macuk A., *„Nesryvaemye” i „uspešnye” sejmiki v Velikom knâžestve Litovskom vo vremâ pravleniâ Avgusta III*, [v:] *XVIII amžiaus studijos*, t. 1: *Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė: tarp tradicijų ir naujovių*, sud. R. Šmigelskytė-Stukienė, Vilnius 2015, s. 37–38.

Macuk A., *Ruh pasèsaraŭ „nojburgskìh uladannâŭ”*, „Geral’d Litherland”, Grodna 2007, Nr 17, s. 26–37.

Macuk A., *Stèfan Alendskì – lìdar šlâhty Vaŭkavyskaga paveta ŭ sârèdzìne XVIII st.*, „Geral’d Litherland”, Grodna 2003, Nr 11–12, s. 47–54.

Palkij H., *Praca komisji aukcji wojska w latach 1736–1738*, „Kwartalnik Historyczny” 1999, R. CVI, Nr 1, s. 19–44.

Szczygielski W., Zielińska Z., *Olędzki Stefan*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXIII, Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk 1978, s. 798–800.
Zielińska Z., *Massalski Michał Józef*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XX, Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk 1975, s. 141–143.
Zielińska Z., *Oskierko Gerwazy Ludwik*, [w:] *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXIV, Warszawa–Wrocław–Kraków–Gdańsk 1979, s. 358–360.
Zielińska Z., *Walka „Familii" o reformę Rzeczypospolitej, 1743–1752*, Warszawa 1983.